# ПУШЧА ВЫСТАЯЛА І ПЕРАМАГЛА


## Гарошка Д. С., Зарэцкая В. П.

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт

Научный руководитель: к.м.н., дацэнт Івашын В. М.


**Актуальность.** Белавежская пушча – адна з найважнейшых славутасцяў Беларусі Прыгажосць Белавежскай пушчы да гэтага часу цешыць вока кожнаму турысту, які хоць раз у жыцці ступіць на гэтую зямлю. Але мала хто ведае, колькі ёй давялося пражыць у гады вайны, колькі багацця яна страціла.

**Цель.** Аднавіць падзеі вызвалення Белавежскай пушчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікау.

**Методы исследования.** Аналіз дакументаў, вывучэнне артыкулаў па дадзенай тэме, абагульненне і сістэматызацыя матэрыялу.

**Результаты и их обсуждение.** У першыя ж дні вайны ў Белавежскай пушчы і яе ваколіцах адразу пачалі стварацца партызанкія групы і атрады з ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, трапіўшых у акружэнне, падпольшчыкаў, мясцовага насельніцтва. Для аказання дапамогі ў барацьбе з фашыстамі на Беласточчыну ў 1943 г. прыбылі добра ўзброеныя і загартаваныя ў баях партызаны злучэння Мінскай вобласці. Адной з брыгад “У імя Радзімы” была выдзелена зона дзеяння ў раёнах, якія прылягалі да пушчы. Калі гітлераўскія войскі каціліся ўжо на захад і пачаўся новы перыяд барацьбы партызан за захаванне прамысловых аб’ектаў, дарог і мастоў, населеных пунктаў і дзяржаўных установ ад разбурэння адступаючымі фашысцкімі войскамі, камандзір брыгады даручыў атраду імя Багдана Хмяльніцкага не дапусціць ворага ў тое месца, дзе былі тады зубры. У фашыстаў, як успамінае былы камандзір 65-й арміі генерал П.І.Батаў, быў загад, згодна з якім яны павінны былі затрымаць рускіх яшчэ на подступах да Белавежскай пушчы і аказваць у лясах упартае супраціўленне да падрыхтоўкі асноўнага рубяжу абароны па рацэ Заходні Буг. Але фашысты здолелі кінуць насустрач наступаючым войскам толькі саперныя групы, якія замініравалі дарогі, раскідалі супрацьтанкавыя міны па лясным масіве, узарвалі палац і падпалілі музей прыроды Белавежскай пушчы. Пажар удалося патушыць, а вось міны пашкодзілі і заблі шмат дзікіх жывёл.

**Выводы.** Але мала хто ведае, колькі ёй давялося пражыць у гады вайны, колькі багацця яна страціла.

### ЛИТЕРАТУРА


1. Мікалаева, В. М. Флора Беларужскай пушчы / В. М. Мікалаева, Б. М. Зефіраў. – Мінск, 1971. – 184 с.
2. Качаноўскі, С. Б. Гісторыя. Зубры / С. Б. Качаноўскі, Л. Н. Корачкіна. – Мінск, 1976. – 128 с.
3. Глінскі, Ф. А. Беларужская пушча і зубры. – Беласток, 1899. – 168 с.
4. Карцоў, Г. В. Белавежская пушча. – СПб., 1903. – 97 с.


Репозиторий ГрГМУ